**В. В. Шур**
(Мазыр, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна)

# “РАДЗІМАЗНАЎСТВА: МАЗЫРШЧЫНА” ЯК ВУЧЭБНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА Ў ШКОЛАХ І ВНУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі Рэспублікі Беларусь адзін з асноўных напрамкаў – фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму асобы. Няма, мабыць, неабходнасці шырока гаварыць пра патрыятызм у шырокім сэнсе, бо гэта задача была актуальнай і раней, прычым не толькі ў нас. Для нас, беларусаў, гэтыя задачы актуалізаваліся асабліва, калі рэспубліка стала незалежнай дзяржавай, якая валодае багатай еўрапейскай гісторыяй і культурай. У аснове вучэбнага курса *“Мазыразнаўства…”*, на наш погляд, павінна быць пакладзена засваенне агульначалавечых каштоўнасцей, культурных традыцый беларусаў і іншых народаў, якія стагоддзямі жывуць на нашай зямлі. Патрэба, неабходнасць і актуальнасць у школах і ВНУ Рэспублікі Беларусь чытання такіх курсаў узрастае ў сувязі з актуалізацыяй у апошнія гады агульнадзяржаўных задач аб правядзенні і рэалізацыі ў маштабах ўсёй Беларусі галоўных дзяржаўных выхаваўчых і патрыятычных праграм і мерапрыемстваў пад назвамі *“Год навукі”*, *“Год Малой Радзімы”*. На жаль, даволі доўга ў папярэднія гады дзесяцігоддзямі ў рэспубліцы культываваліся і пашыраліся сцверджанні, настроі, якія садзейнічалі развіццю нацыянальнага нігілізму, ігнараванню свайго самабытнага, непаўторнага, а сваё адметнае, нацыянальнае, спецыфічнае кваліфікавалася негатыўна, падавалася як праяўленне нацыяналізму, асабліва гэта выявілася ў дачыненні да роднай мовы. А былі ж перыяды, калі беларускую літаратуру ў школах спрабавалі выкладаць на рускай мове, а ў многіх, асабліва гарадскіх, школах зусім не выкладалася беларуская мова і літаратура, гісторыя Беларусі. Абсурдам было б, каб рускую літаратуру, напрыклад, у Расіі выкладалі і чыталі па-англійску?!

Радзімазнаўчыя курсы чытаюцца ў многіх рэгіёнах Расійскай Федэрацыі, напрыклад, у Маскве ў школах выкладаецца прадмет “Масквазнаўства”, ёсць такія курсы і ў некаторых школах Беларусі. Так, у суседнім Калінкавіцкім раёне, у аграгарадку *Залатуха*, настаўніца гісторыі і геаграфіі Паліна Фёдараўна Дзяцініна − ініцыятар стварэння школьнага этнаграфічнага музея, яна ж першай у раёне распрацавала і ўкараніла ў вучэбныя планы школы спецыяльны факультатыўны курс па гісторыі свайго паселішча, які так і называецца *“Залатухазнаўства”* [1, с. 8].

І як пісаў У. А. Лякін у кнізе *“Калиновый край в именах и названиях”*, *“Хочацца верыць, што калі-небудзь, дзякуючы намаганням патрыётаў-краяведаў, пераадолеўшы, як водзіцца, варожае раўнадушша чынуш, у школах і іншых установах нашага горада і раёна з’явіцца факультатыў з такой, прыкладна, назвай: «Радзімазнаўства: Калінкавіцкая зямля». Вядома ж, што веды, факты сваёй радаслоўнай, духоўных каранёў, гісторыка-культурных набыткаў, жаданне іх захаваць і павялічыць – аснова выхавання сапраўднага грамадзяніна і абаронцы Айчыны”.*

МГПУ им. И.П.Шамякина

Асноўная мэта факультатыва *“Радзімазнаўства: Мазыршчына”* – на канкрэтных прыкладах аказаць уплыў на фарміраванне здаровага светапогляду навучэнцаў, на ўсведамленне прыгажосці сваей *“малой радзімы”*, на адчуванне сувязі і еднасці розных пакаленняў, на бачанне багацця і ўнікальнасці мясцовай флоры і фаўны, духоўнай і матэрыяльнай культуры землякоў, радасці стваральнага жыцця, набыткаў багатай гісторыі з яе не толькі гераічнымі, але і трагічнымі старонкамі. Школьнікі і студэнты, засвоіўшы змест гэтага факультатыву, безумоўна, будуць ганарыцца сваёй Бацькаўшчынай, імкнуцца памнажаць яе набыткі, выкарыстоўваць багаты вопыт сваіх землякоў і блізкіх. Факультатыў скіраваны на выхаванне асобы гуманістычных і дэмакратычных поглядаў з развітым пачуццём нацыянальнай самапавагі, патрыёта-грамадзяніна, чуйнага да сацыяльнага, рэгіянальнага, нацыянальнага поліфанізму, здольнага памнажаць інтэлектуальныя і матэрыяльныя багацці папярэднікаў, дастойна выяўляць сваёй штодзённай дзейнасцю агульначалавечыя каштоўнасці. Пачуццё патрыятызму, павагі да роднага краю, сваіх землякоў дасць станоўчы імпульс. Вучні і студэнты на шматлікіх прыкладах, засвоеных на занятках, пераканаюцца ў тым, што іх Бацькаўшчына – унікальная састаўная частка Рэспублікі Беларусь, а іх землякі ў розныя перыяды нашай гісторыі ўнеслі значны ўклад у развіццё яе эканамічнага, навуковага і духоўнага патэнцыялу і годна заявілі пра сябе ў важнейшых лёсавызначальных падзеях мінулага і сучаснага.

Ранейшая сістэма адукацыі і выхавання, на жаль, была арганізавана такім чынам, што рэгіянальным асаблівасцям не надавалася належнай увагі. Некаторых выдатных асоб, ураджэнцаў Беларусі, нярэдка мы адкрываем для сябе толькі тады, калі яны станавіліся сусветна вядомымі ў далёкіх ад нашай Радзімы-Мазыршчыны краінах (*Эдуард Пякарскі, Пятро Ракіцкі, Іосіф Яленскі, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Іеранім Кеневіч, Геся Гельфман, Міхаіл Барысаў, Вера Харужая, Аляксандр Крукоўскі, Ксенафонт Марціновіч, Святлана Алексіевіч* і інш.). Некаторыя з названых імёнаў аказаліся забытымі ў сябе на радзіме, але сталі нацыянальным гонарам іншых краін і народаў.

Радзімазнаўства дае магчымасць арганізаваць адукацыйны і выхаваўчы працэсы ў цікавай, займальнай форме. Апрача лекцый і практычных заняткаў, педагог часцей, чым на іншых прадметах школьнага цыкла, можа планаваць наведванне музеяў, правядзенне экскурсій з наступным іх абмеркаваннем, афармленне стэндаў, камплектаванне картатэкі фальклорных, этнаграфічных, краязнаўчых матэрыялаў, што будзе садзейнічаць падрыхтоўцы навучэнцаў да арганізацыі пошукавай і навуковай работы. Заняткі можна праводзіць з запрашэннем мясцовых краязнаўцаў, работнікаў музеяў, ветэранаў вайны і працы, вучоных, якія даследавалі мясцовыя праблемы. Неабходным кампанентам практычных заняткаў можа быць аналіз артыкулаў, мемуарнай літаратуры, прац даследчыкаў, якія займаліся вывучэннем духоўнай і матэрыяльнай культуры Мазыршчыны, азнаямленне з архіўнымі матэрыяламі, дакументамі-першакрыніцамі, арыгінальнымі публікацыямі, напрыклад, абмеркаванне кніг А. Бабра, У. Лякіна, М. Копача.

Названы факультатыў дазваляе ў значнай меры ажыццяўляць на занятках прынцып рознаўзроўневага навучання: дыферэнцыяцыя ў падыходах можа рэалізоўвацца не толькі ў выбары і рэкамендацыі асобных тэм, а і ў іх паглыбленым і параўнальным вывучэнні з наступным абмеркаваннем важнейшых тэарэтычных паняццяў, свядомае засваенне якіх найлепшым чынам можна ажыццяўляць на мясцовым краязнаўчым матэрыяле.

**Мэта** факультатыўных заняткаў – фарміраванне ў школьнікаў і студэнтаў ведаў аб родным краі, аб Мазыршчыне ў агульнабеларускім і сусветным кантэксце; выхаванне патрыятызму, нацыянальнай свядомасці, любові да Бацькаўшчыны.

**Задачы:**

– абуджаць цікавасць да роднага краю і паглыбіць веды аб унікальным рэгіёне Палесся;

– далучаць маладое пакаленне да вывучэння набыткаў багатай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны нашага народа, акцэнтуючы ўвагу на фактах, якія закліка125 спрыяць фарміраванню свядомасці школьнікаў і студэнтаў, іх грамадзянскага станаўлення, да адчування ўнутраннай патрэбы вучыцца і працаваць на карысць нашай Радзімы;

– паглыбляць і ўдасканальваць веды пра Мазыршчыну, выкарыстоўваючы мясцовы матэрыял, спалучаючы яго з набытымі ведамі на ўроках гісторыі, роднай мовы, літаратуры, геаграфіі, абагульняючы і ўводзячы ў змест навучання элементы краязнаўства, этнаграфіі быту, сучаснай гістарычнай і грамадскай думкі;



МГПУ им. И.П. Шамякина

– выхоўваць у школьнікаў і студэнтаў беражлівыя і паважлівыя адносіны да ўсяго лепшага, створанага землякамі, іх мовы, фальклору, мясцовых прыродных багаццяў, вынікаў штодзённай працы;

– абуджаць у вучняў і студэнтаў жаданне авалодваць неабходнымі для жыцця ведамі;

– павышаць сваю эстэтычную і экалагічную культуру;

– навучыць вучняў і студэнтаў збіраць і сістэматызаваць мясцовыя факты пра важнейшыя падзеі на Мазыршчыне, пра асоб, якія праславілі сябе ў ратных і працоўных справах, учынках, пра легенды, паданні, назвы-тапонімы, іх разнавіднасці – айконімы, гідронімы, урбанонімы;

– спрыяць фарміраванню маральна-эстэтычных поглядаў вучняў і студэнтаў, лагічнага мыслення, эрудыцыі, узбагачэнню слоўнікавага запасу і агульнай моўнай культуры.

Намі апублікаваны дапаможнік для магістрантаў з грыфам вучэбна-метадычнага аб’яднання БДУ па гуманітарнай адукацыі “Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапанімія і тапанімія” (Мазыр, 2018. – 355 с.), у якім змешчыны багаты краязнаўчы матэрыял пра Мазыршчыну, напрыклад, пра горад Мазыр як сталіцу Усходняга Палесся, яго раслінны і жывёльны свет, важнейшыя падзеі ў гэтай частцы нашай радзімы, пра славутасці Мазыра і Мазыршчыны, вядомых вучоных, вайскоўцаў, пісьменнікаў, спартсменаў. Пададзена багая інфармацыя пра навукова-папулярную, краязнаўчую, гістарычную, мастацкую літаратуру пра Мазыр і Мазыршчыну і інш. У папярэднія гады намі ў часопісе *“Роднае слова”* была апублікавана вучэбная праграма факультатыўных заняткаў для сярэдняй школы “Радзімазнаўства: Мазыршчына”, якая папярэдне была абмеркавана і зацверджана на пасяджэнні Савета дзяржаўнай установы адукацыі “Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі”. Дапаўняюць змест гэтага курса наступныя працы:

1. Гісторыка-дакументальная хроніка “Памяць: Мазыр і Мазырскі раён” (Мінск, 1997. – 574 с.) (у суаўтарстве), а таксама кнігі У. Лякіна, А. Бабра;

2. Уласнае імя ў соцыуме і мастацкім тэксце: манаграфія (Мінск, 2015. – 300 с.). У гэтай кнізе значная частка прысвечана апісанню рэалій Мазыршчыны (гл. § “Малая радзіма ў анамастыконе пісьменнікаў”, “Урбананімія Мазыра ў часе і прасторы”, “Палессе – унікальны лінгва-гісторыка-культурны і ландшафтна-этнаграфічны рэгіён Беларусі і Украіны”);

3. Уласныя імёны ў часе і прасторы (Мінск, 2008).

У якасці прыкладаў назавем некаторых вядомых людзей Мазыршчыны, творчыя лёсы якіх будуць прадстаўлены ў нашай кнізе.

Выдатнай асобай, якая праславіла не толькі Мазыршчыну, з’яўляецца выпускнік Мазырскай гімназіі 1912 г. *Канстанцін Іакінфавіч Былінскі*, у будучым прафесар Маскоўскага ўніверсітэта імя М. Ламаносава, доктар філалагічных навук, вялікі вучоны ў галіне рускай стылістыкі і распрацоўкі правіл рускай арфаграфіі, якімі мы кіруемся і ў наш час. Для мазыран гэта імя фактычна раскрыла бібліятэкар Цэнтральнай бібліятэкі імя А. Пушкіна Н. В. Цюленева і карэспандэнт мясцовай газеты Н. Шэраш. Прыводзім асноўныя, найбольш істотныя і важныя, на наш погляд, звесткі пра ўнікальнага вучонага. Маці Канстанціна Былінскага закончыла Парыцкае жаночае Святой Марыі Магдалены вучылішча, бацька, Іакінф Пятровіч, быў настаяцелем храма і адначасова выкладаў у Мазырскай гімназіі. Варта адзначыць, што ён саставіў *“Житие и подвиги Святого Кирилла, Епископа Туровского”*, якое было надрукавана ў мазырскай тыпаграфіі Х. Кугеля ў 1911 г. К. Былінскі закончыў мазырскую гімназію з залатым медалём, а затым з адзнакаю гісторыка-філалагічны факультэт Імператарскага Маскоўскага ўніверсітэта і быў накіраваны выкладчыкам рускай мовы ў Маскоўскі археалагічны інстытут. У першыя гады Савецкай улады (20–30-я гады XX ст.) выкладаў рускую мову на рабфаках Масквы, далучаючы “масы працоўных” да культуры рускай мовы, кіраваў кафедрамі ў шэрагу вузаў сталіцы, а ў канцы 30-х гадоў як аўтарытэтны лінгвіст быў запрошаны ў якасці кансультанта ва Усесаюзны радыёкамітэт, дзе пасябраваў на доўгія гады з Юрыем Левітанам –

МГПУ им. И.П.Шамякина

галоўным дыктарам радыё Савецкага Саюза. Вядома, што многія важныя паведамленні, зводкі, ваенныя інфармацыйныя паведамленні Савінфармбюро, перш чым аб'яўляцца па радыё, вычытваліся і стылёва выпраўляліся прафесарам К. І. Былінскім. Памылак, як вядома, там не павінна быць. З яго непасрэдным удзелам, напрыклад, была вернута ў гады вайны літара "ё", *"бедная сваячніца"* рускага алфавіту, якая ігнаравалася і не заўсёды правільна выкарыстоўвалася, на што ў адным з важных дакументаў звярнуў увагу нават І. В. Сталін. Быў тэрмінова створаны адпаведны даведнік *"Употребление буквы Ё"*, аўтарам якога стаў наш зямляк. У пасляваенныя гады ён агульнапрызнаны як заснавальнік рускай практычнай стылістыкі, якую студэнты-журналісты называлі *былістыкай* – ад прозвішча аўтарытэтнага лінгвіста. Пра высокі інтэлектуальны узровень К. І. Былінскага хадзілі легенды. Калегі нашага земляка ва ўспамінах адзначалі: *"Яго эрудыцыя была каласальнай… Каб дасягнуць такога ўзроўню ведаў, верагодна, патрэбна было б пачынаць жыць з самага пачатку і не губляць ніводнага дня…"*

*Святлана Алексіевіч* − першы з беларускіх пісьменнікаў лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (2015 год) *"за шматгалосае гучанне яе прозы і увекавечванне пакутаў і мужнасці"*. *Святлана Аляксандраўна Алексіевіч* нарадзілася 31 мая 1948 года ў Івана-Франкоўску (раней Станіславаў) у сям'і ваеннага (бацька беларус, маці ўкраінка). Пасля дэмабілізацыі сям'я пераехала на *Мазыршчыну* і яе школьныя гады і станаўленне як творчай асобы адбывалася на *Палессі*. Святлана ў 1965 г. скончыла Капаткевіцкую сярэднюю школу Петрыкаўскага раёна, была выхавальніцай Асавецкай школы-інтэрната, затым настаўніцай гісторыі і нямецкай мовы ў Балажэвіцкай сямігодцы Мазырскага раёна. Скончыла аддзяленне журналістыкі БДУ. Потым праца ў раённых газетах *"Прыпяцкая праўда"* (Нароўля), *"Маяк камунізму"* (Бяроза), у рэспубліканскай прэсе (*"Сельская газета"*, часопіс *"Неман"*). Член Саюза пісьменнікаў з 1983 г. Піша пераважна па-руску, сваімі настаўнікамі ў літаратуры лічыць Алеся Адамовіча і Васіля Быкава.

Асноўны яе літаратурны жанр – *аповеды* (исповеди – В.Ш.) людзей, якія перажылі самыя складаныя жыццёвыя выпрабаванні, крытыка рэалій пэўных перыядаў былога СССР. Пра свой жанр яна паведамляла: *"Схватить подлинность – вот что хотелось. И этот жанр – жанр человеческих голосов, исповедей, свидетельств и документов человеческой души мгновенно был мною присвоен"*.

Асноўныя яе працы: цыкл *"Галасы ўтопіі"*, куды ўвашлі кнігі *"У войны не женское лицо"* (1983), *"Последние свидетели: Соло для детского голоса"* (1985), *"Цинковые мальчики"* (1989), *"Чернобыльская молитва"* (1997), *"Время сэконд хэнд"* (2013). Па-за гэтым цыклам: *"Зачарованные смертью"* (1993), *"Чудный олень вечной охоты"* (2006), яна аўтар п'есы *"Марутка"* і аўтар сцэнарыяў некалькіх дакументальных фільмаў.

Узнагароджана ордэнам *"Знак пашаны"*, лаўрэат многіх літаратурных узнагарод і прэмій Саюза пісьменнікаў СССР і многіх іншых краін: ЗША, Францыі, Германіі. Яе творчасць аналізавалі Адам Мальдзіс, Алесь Бельскі, Мікола Гіль і інш. даследчыкі. Жыла з 2000-х гадаў у Італіі, Францыі, Германіі, з 2013 года зноў пражывае ў Беларусі.

**Літаратура**

1. Лякин, В. А. Калиновый край в именах и названиях: историко-топонимический очерк / В. А. Лякин. – Минск: Кологрrecord, 2016. – 136 с.

2. Шур, Васіль. Радзімазнаўства: Мазыршчына: праграма факультатыўных заняткаў (VIII клас) / Кузьміч Леанід // Роднае слова. – 2014. − № 11. – С. 48–52.

МГПУ им. И.П.Шамякина